***К. Д. Варанько,***
*вядучы бібліёграф Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі*

# 29 ЛІПЕНЯ — 130 ГАДОЎ З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ М. В. АЗБУКІНА (1894–1943), ВУЧОНАГА-ГЕОГРАФА, КРАЯЗНАЎЦЫ

Гісторыя развіцця эканамічнай геаграфіі Беларусі звязана з імем Мікалая Васільевіча Азбукіна. Сваёй плённай навуковай дзейнасцю вучоны моцна паўплываў на розныя галіны гаспадаркі і культуры як усёй краіны, так і яе асобных рэгіёнаў, заклаў асновы краязнаўчага руху Беларусі.

Нарадзіўся М. В. Азбукін у Бабруйску ў дваранскай сям'і. У 1912 г. скончыў Бабруйскую гімназію, у 1917 г. — прыродазнаўчае аддзяленне фізіка-матэматычнага факультэта Санкт-Пецярбургскага дзяржаўнага ўніверсітэта. У гады навучання ўдзельнічаў у рабоце гуртка па даследаванні Гродзенскай губерні.

Пасля атрымання дыплома працаваў настаўнікам геаграфіі і прыродазнаўства ў Славянскай гімназіі ў Бабруйску. Быў дырэктарам Першай савецкай школы II ступені імя Янкі Купалы. Уваходзіў у камітэт Беларускага культурна-асветнага таварыства Бабруйска, створанага ў 1917 г.

У 1921 г. М. В. Азбукін па запрашэнні Народнага камісарыята асветы пераехаў у Мінск і пачаў працаваць у Навукова-тэрміналагічнай камісіі, якая паслужыла асновай для стварэння Інстытута беларускай культуры (з 1929 г. — Беларуская акадэмія навук). У першай палове 1920-х гг. ён неаднаразова ўдзельнічаў у экспедыцыях, збіраў матэрыялы для беларускага геаграфічнага слоўніка. У 1923 г. вучоны стварыў і ўзначаліў краязнаўчы кабінет пры педагагічным факультэце Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. З гэтага ж года чытаў лекцыі па эканамічнай геаграфіі. Пазней выкладаў геаграфію Беларусі ў 13-й Савецкай працоўнай школе. Быў сакратаром прыродазнаўчай секцыі Інстытута беларускай культуры, уваходзіў у склад камісій і секцый прыродазнаўчага і геаграфічнага кірункаў.

З 1924 г. М. В. Азбукін як вучоны сакратар Цэнтральнага бюро краязнаўства фактычна ажыццяўляў кіраўніцтва краязнаўчымі арганізацыямі Беларусі. У 1925 г. ён увайшоў у склад камісіі па арганізацыі геафізічнай службы. У 1927 г. паступіў у аспірантуру геаграфічнага факультэта Ленінградскага дзяржаўнага ўніверсітэта. З 1929 г. працаваў старшым навуковым супрацоўнікам кафедры геаграфіі Беларускай акадэміі навук.

У 1930 г. рэпрэсіраваны і высланы ў Налінск. Там ён выкладаў у мясцовай школе, а затым быў пераведзены ў Вятку. Звестак аб тым, як вучоны правёў апошнія гады жыцця, захавалася няшмат. Рэабілітаваны ў 1957 г.

Мікалай Васільевіч праводзіў краязнаўчую работу ў рэгіёнах, распрацаваў беларускую геаграфічную тэрміналогію. Ён шмат увагі надаваў даследаванню беларускіх населеных пунктаў, сярод якіх — Пагост, Беразіно, Шацк, Ляды, Бялынічы і інш.

Вучоны ўнёс значны ўклад у станаўленне айчыннай тэрмінаграфіі. Ён прымаў удзел у падрыхтоўцы трох тэрміналагічных слоўнікаў серыі «Беларуская навуковая тэрміналогія» (БНТ). Разам з Л. Л. Більдзюкевічам М. В. Азбукін падрыхтаваў

трэці выпуск БНТ «Геаграфічныя і касмаграфічныя тэрміны і назвы нябесных цел» (1923).

Ён быў актыўным удзельнікам праекта Інбелкульта па батанічнай тэрміналогіі, вынікам якога стаў слоўнік «Батаніка агульная і спецыяльная» (1924).

Найбольшую вядомасць атрымала кніга М. В. Азбукіна «Геаграфія Еўропы» (1924), дзе прыведзены гісторыка-этнаграфічны агляд тэрыторый краін Заходняй, Цэнтральнай і Усходняй Еўропы. Адзін з раздзелаў працы прысвечаны Беларусі. Аўтар даў грунтоўную характарыстыку асаблівасцей рэльефу краіны, кліматычных умоў, водных шляхоў, эканомікі, складу насельніцтва, прывёў антрапацэнтрычныя, лінгвістычныя і культуралагічныя назіранні.

Разам з А. А. Смолічам ён апублікаваў працу «Геаграфія пазаеўрапейскіх краёў» (1925). У ёй прадстаўлены агляд геаграфічных асаблівасцей Азіі, Афрыкі, Амерыкі, Аўстраліі, Акіяніі і Антарктыды.

Апошні са слоўнікаў Інбелкульта, у падрыхтоўцы якога прымаў удзел М. В. Азбукін, — 12-ты выпуск БНТ «Назвы жывёл» (1927). У працы «Паселішчы гарадскога тыпу ў БССР» (1928) аўтар аналізаваў пытанні і прынцыпы тыпалагізацыі паселішчаў айчынных і замежных вучоных.

Мікалай Васільевіч быў рэдактарам краязнаўчага часопіса «Наш край», падрыхтаваў падручнікі па геаграфіі для сярэдняй школы.

Навуковая спадчына М. В. Азбукіна мае вялікае значэнне і для сучаснай беларускай навукі. Шырокая эрудыцыя дазволіла яму сфарміраваць асновы для вывучэння як айчыннай, так і замежнай геаграфіі і стаць адным з самых знакамітых географаў даваеннага часу.

### Спіс выкарыстаных крыніц

1. Азбукін Мікалай Васілевіч // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. — Мінск, 1996. — Т. 1. — С. 153.

2. Азбукин Николай Васильевич // Республика Беларусь : энциклопедия : в 7 т. — Минск, 2006. — Т. 2. — С. 48.

3. Азбукін Мікалай Васілевіч // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. — Мінск, 1993. — Т. 1. — С. 68.

4. Азбукин Николай Васильевич // Регионы Беларуси : энциклопедия : в 7 т. — Минск, 2020. — Т. 6. Могилёвская область : в 2 кн. — Кн. 1. — С. 12.

5. Азбукін Мікалай Васілевіч // Янка Купала : энцыклапедыя : у 3 т. — Мінск, 2017. — Т. 1. — С. 26.

6. Азбукін Мікалай Васільевіч // Бялыніччына : краязнаўчы энцыклапедычны даведнік / укладальнік М. Карпечанка. — Мінск, 2011. — С. 10.

7. *Болатаў, А. М.* М. В. Азбукін (1894–1943) / А. М. Болатаў, Г. У. Рыдзеўскі // Нашы знакамітыя землякі: географы і геолагі — ураджэнцы Магілёўскай вобласці : біёграфа-бібліяграфічны даведнік / Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, Установа адукацыі «Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. А. Куляшова» ; аўтары-складальнікі: А. Катлёнак і інш. ; пад агульнай рэдакцыяй І. М. Шарухі. — Магілёў, 2004. — С. 6–7.

8. *Грунтоў, С. У.* Мікалай Азбукін / С. У. Грунтоў, Я. І. Грыневіч, Н. І. Саўчанка // Забытая экспедыцыя 1923 года: ля вытокаў акадэмічнай этнаграфіі ў Беларусі : альбом-манаграфія / С. У. Грунтоў, Я. І. Грыневіч, Н. І. Саўчанка ; Нацыянальная акадэмія навук Беларусі, Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры. — Мінск, 2023. — С. 183–190.

9. *Дзятко, Д. В.* Мікалай Азбукін / Д. В. Дзятко, П. А. Міхайлаў // Мовазнаўцы : нарысы па гісторыі беларускай лінгвістыкі. — Мінск, 2017. — С. 139–148.

10. *Дзятко, Д. В.* Мікалай Азбукін / Д. В. Дзятко // Роднае слова. — 2015. — № 3. — С. 36–39.

11. *Торканевский, А. А.* Николай Васильевич Азбукин, 29.07.1894–24.11.1943 / А. А. Торканевский // Интеллектуальная элита Беларуси : основоположники белорусской науки и высшего образования (1919–1961) / Белорусский государственный университет ; научный редактор О. А. Яновский. — Минск, 2019. — С. 9–16.



Нацыянальная бібліятэка Беларусі